

КЛАСІКА — НА ЭКРАНЕ

5

ТРЭЦІ — ЗУСІМ НЕ ЛІШНІ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

26 ЖНІЎНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 167 (29789)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Беларуская адукацыя становіцца ўсё больш папулярнай за мяжой: за апошнія пяць гадоў колькасць замежных студэнтаў у краіне павялічылася ў паўтара раза: з 17 тысяч чалавек 5 гадоў таму яна вырасла да 32 тысяч са 107 краін сёння. У сістэме адукацыі адбываецца паступовае амаладжэнне педагагічных кадраў, доля пенсіянераў сярод настаўнікаў — 9,5 працэнта. Мы лічым, што гэта аптымальная лічба, таму што маладое пакаленне, маладыя спецыялісты, якія прыходзяць працаваць у школы, маюць патрэбу ў настаўніцтве, і хто, як не тыя педагогі, якія ўсё жыццё адпрацавалі ў адукацыі, можа перадаць гэты вопыт. Гэта добры сплаў маладосці і вопыту».*

# СЯМЕЙНЫ АРКЕСТР



Майстар ручной лепкі з гліны Ганна ГУДОЎСКАЯ працуе ў філіяле Бешанковіцкага дома рамёстваў болей чым дваццаць гадоў, яна сталая ўдзельніца шматлікіх культурных падзей і імпрэз раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў: фэстаў, кірмашоў, выставак. Керамічныя і ганчарныя вырабы Ганны Мікалаеўны — а гэта і скульптуры невялікіх формаў, і посуд, і цацкі-свістулькі — упрыгожваюць экспазіцыю выстаўкі, якая не першы год дзейнічае ў самім доме рамёстваў. Можна і паглядзець, і нават патрымаць у руках. Дзевяцігадоваму сыну Радзівону падабаюцца творы сваёй матулі-рукадзельніцы. На канікулах хлопчык часта наведвае творчую ўстанову,назірае і спрабаваў ляпіць, дапамагаў, асабліва калі трэба было «агучыць» новыя свістулькі і гліняныя музычныя інструменты.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Міліцыя ў Мінску праводзе мерапрыемства «Быт» па папярэджанні хатняга насілля.

• **Каханне пад купалам цырка. Паветраныя гімнасты з Беларусі заваявалі Гран-пры фестывалю ў Казахстане.**

• Фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» пройдзе 27 жніўня.

• **Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» пройдзе ў Смаленску з 14 па 19 верасня.**



ISSN 1990 — 763X

22167

Месца для жыцця

## У НАВУЧАЛЬНЫ ГОД — З БЕЛАРУСКІМ ПАШПАРТАМ



Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

Наталля ШАЎЧУК з сынам Дарафеем і дачкой Дарынай.

**Украінцы з пасведчаннем права жыхарства ў Беларусі Ігар і Наталля ШАЎЧУКІ і іх двое дзетак плануюць ужо ў верасні стаць паўнапраўнымі грамадзянамі краіны, у якой змаглі пабудаваць сваё сямейнае шчасце. Усе чацвёра рыхтуюцца атрымаць беларускае грамадзянства. Ураджэнцы Вінніцкай вобласці — маладыя на той момант спецыялісты, муж і жонка Шаўчукі — пераехалі жыць у Гомельскі раён у 2014 годзе. Найлепшае месца для жыцця, як цяпер называюць свой аграгарадок Чарацянка ўкраінцы, знайшлі зусім выпадкова. Прыкіпелі — не тое слова.**

СТАР. 3

Новыя навыкі

## НЯМА МЯЖЫ ДЛЯ ДАСКАНАЛАСЦІ,

### або Верасень як падстава пачаць «расці над сабой»

**Лета практычна скончылася — пра гэта нагадвае рэклама анлайн- і афлайн-курсаў, студый, секцый і іншых устаноў, якія прапануюць адукацыю і развіццё дзецям і дарослым. Як не згубіцца ў іх разнастайнасці?**

СТАР. 4



На міжнароднай арэне

# Выйсце — у прамысловай кааперацыі

**Раман ГАЛОЎЧАНКА прыняў удзел у пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета, якое гэтымі днямі праходзіць у Кыргызстане**

**Сімвалічна, што паралельна з важным мерапрыемствам, якое садзейнічае ўмацаванню інтэграцыі, працуе і Першы маладзёжны форум ЕАЭС і СНД, які сабраў на сваёй пляцоўцы звыш 200 дэлегатаў. Сярод іх — дзяржаўныя служачыя, маладыя прадпрымальнікі, дыпламаты, студэнты. Менавіта ад маладога пакалення залежаць далейшае развіццё супрацоўніцтва дзяржаў-членаў і папулярызацыя ідэі еўразійскай інтэграцыі.**

Падчас сустрэчы Прэзідэнта Кыргызстана Садыра Жапарава з кіраўнікамі дэлегацый — удзельнікамі пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета прэм'ер-міністр Беларусі расказаў, што работа над пазбаўленнем бар'ераў і перашкод ідзе паспяхова, аднак, нягледзячы на гэта, усё яшчэ застаюцца пэўныя складанасці. Над іх пераадоленнем працуе і Еўразійская эканамічная камісія, з якой у Беларусі не проста гандлёвы саюз, а саюз эканамічны.

— Ёсць агульныя выклікі, якія падобныя для эканомік усіх краін, у прыватнасці неабходнасць павышэння долі сегмента прамысловасці (асабліва апрацоўчай) у эканоміцы, прыцягнення інвестыцый у гэту сферу, — адзначыў Раман Галоўчанка. — Таму лічу, што жыццёва неабходна ўжо цяпер актывізаваць сумесную работу ў прамысловай сферы, перайсці да рэалізацыі канкрэтных праектаў прамкааперацыі або скразных прамысловых праектаў, якія мабілізуюць патэнцыял дзяржаў і даюць магчымасць развіваць далей высокатэхналагічным сектарам.

Кіраўнік беларускага ўрада звярнуў увагу на ініцыятыву нашай краіны аб пілотным кааперацыйным праекце «Еўразійскі электробус». «Лічым, што ЕЭК паглыбіцца ў гэтае пытанне і давядзе справу да канца, — заўважыў ён. — Мэта зразумелая — скарыстацца перавагамі ЕАЭС і падзяліцца адзін з адным кампетэнцыямі, наладзіць выпуск высокатэхналагічнай прадукцыі пад агульным еўразійскім брэндам. Разлічваем, што бізнес усіх краін таксама з задавальненнем падтрымае гэту ініцыятыву. Акрамя таго, вельмі важна знайсці правільны інструмент фінансавага суправаджэння прамкааперацыі».

**Паводле БелТА.**

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 27 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

— намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК.
Тэл. 8 016 226 99 26;

— намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ.
Тэл. 8 021 222 22 22;

— намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ.
Тэл. 8 023 233 12 37;

— намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК.
Тэл. 8 015 273 56 44;

— першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ.
Тэл. 8 017 500 41 60;

— намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР.
Тэл. 8 022 250 18 69;

— першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК.
Тэл. 8 017 222 44 44.

З нагоды

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

# З Гомеля да Добруша — у тэматычным цягніку,

**але толькі падчас святкавання**

**Напярэдадні Дня беларускага пісьменства Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі запусціць тэматычна аформлены дызель-цягнік ДР1Б рэгіянальных ліній эканом-класа.**



На кузавах вагонаў можна будзе ўбачыць прынты з лагатыпам і назвай свята, а на вокнах — цытаты з выказваннямі вядомых беларускіх пісьменнікаў.

Стылізаваны дызель-цягнік будзе хадзіць у паведамленні «Гомель — Добруш — Гомель» у перыяд з 3 да 4 верасня 2022 года.

Блізкая ўлада

# Вырашаць пытанні кампетэнтна



**Дзесяць грамадзян прыняў старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН падчас чарговага асабістага прыёму. Людзі прыйшлі з самымі рознымі праблемамі, але найчасцей агучвалі пытанні зямельных адносін, спрэчак, якія доўжацца гадамі.**

Алеся Шынкевіч з аграгарадка Калодзішчы расказала, што зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца паміж вуліцамі Караткевіча, Ніжняй і завулкам Акольны, аддалі гадавальніку раслін. Жыхары просяць, каб землі былі перададзены сельскаму Савету. У гэтым выпадку можна было б прадаць надзелы з аўкцыёну для індывідуальнай забудовы. А выручаныя грошы ўкласці ў добраўпарадкаванне населенага пункта. У прыватнасці, пракласці тратуарную дарожку на вуліцы Караткевіча. Да гэтага часу жыхары не могуць забыць аварыю, што тут здарылася, калі загінулі дзеці. Бацькі хвалююцца за бяспеку сваіх дзяцей.

Як адзначыў Аляксандр Турчын, апошнім часам у Калодзішчах пабудавалі дзіцячы садок, школу, шмат сродкаў укладзена ў добраўпарадкаванне. Таму тыя фінансы, што выручаць за продаж участкаў, вобразна кажучы, пагоды не зробяць.

Алеся Шынкевіч хвалюецца, што гэтыя землі могуць выдзеліць і для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі або стварэння вытворчасці.

Аляксандр Турчын запэўніў жанчыну, што такога не будзе. А ў лясным масіве можна абсталяваць дзіцячую пляцоўку.

Заяўніца канстатавала, што ў аграгарадку выдзелена месца для ўладкавання пляцоўкі, і папрасіла аказаць дапамогу ва ўстаноўцы атракцыёнаў. Аляксандр Турчын паабяцаў, што ў дадзеным пытанні будзе аказана садзейнічанне.

Кірыл Кандратаў з Барысава падзякаваў старшыню Мінаблвыканкама за дапамогу. У 2019 годзе ў яго незаконна адключылі ваду. На мясцовым узроўні мужчына не мог дабіцца справядлівасці. І толькі пасля ўмяшання Аляксандра Турчына зноў было наладжана водазабеспячэнне.

У заяўніка з'явілася новая праблема пасля таго, як ён пачаў капітальны рамонт дома. У аддзеле архітэктуры і будаўніцтва Барысаўскага райвыканкама яму растлумачылі, што гэта не рамонт, а рэканструкцыя, на якую ён аформіў неабходныя дакументы. Затым мужчына атрымаў пісьмо з райвыканкама, што на капрамонт даху не трэба рабіць праектную дакументацыю. Калі заяўнік пачаў работы, яго аштрафавалі на 320 рублёў. Акрамя таго, з Кірыла Кандратава патрабавалі натарыяльна завераную пісьмовую згоду сумежнага карыстальніка (частка дома прымыкае да суседняга). Пасля аказалася, што такі дакумент не патрэбны, паколькі мужчына не збіраецца надбудоўваць мансардны паверх.

Паскардзіўся заяўнік і на тое, што ён не можа працаўладкавацца ў Барысаве.

Аляксандр Турчын даручыў абласным службам разабрацца па ўсіх пунктах, агучаных заяўнікам, дапамагчы з афармленнем праектнай дакументацыі на рамонт дома. А старшыні Барысаўскага райвыканкама Мікалаю Карповічу — прапанаваць варыянты працаўладкавання чалавека.

Кампанія «БудпланАэра» пабудавала прыдарожны аб'ект сэрвісу на трасе М1, ладзіць своеасаблівыя экскурсіі-палёты на лёгкаматорных самалётах. Але, па словах заснавальніка фірмы Арцёма Дзікага, каб разгарнуцца больш шырока, неабходнае дадатковае месца для ўладкавання ўзлётна-пасадачнай паласы. Да аб'екта прымыкае зямельны ўчастак, які арандуе прадпрыемства «Смалявічы-Бройлер». Як сцвярджае заяўнік, ён не выкарыстоўваецца. Кампанія хоча атрымаць дазвол на субарэнду ўчастка.

— Землі сельскагаспадарчага прызначэння павінны выкарыстоўвацца толькі па мэтавым прызначэнні. Калі гэтым участкам не будуць займацца «Смалявічы-Бройлер», ён будзе перададзены іншай гаспадарцы, — такі адказ Аляксандра Турчына.

Акрамя таго, кіраўнік цэнтральнага рэгіёна адзначыў, што прыдарожны аб'ект «БудпланАэра» знаходзіцца ў нездавальняючым стане, засмечаны.

— Навядзіце там парадак, — канстатаваў старшыня Мінаблвыканкама. — Затым, магчыма, вернемся да вашага пытання.

Сяргей Колясень з Маладзечна хоча заняцца фермерствам, а менавіта стварыць гаспадарку па вырошчванні яблыкаў па суперінтэнсіўных тэхналогіях. Яму неабходныя 50-100 гектараў зямлі.

Заяўніку прапаноўвалі ўчасткі ў дзвюх сельгасарганізацыях — «Купала-Агра» і «Дуброва», але ён хоча атрымаць надзел непадалёк ад Маладзечна ў «Хожава-Агра».

Аляксандр Турчын даручыў старшыні Маладзечанскага райвыканкама Юрыю Горлаву падабраць некалькі ўчасткаў і прапанаваць фермеру.

Пасля прыёму Аляксандр Турчын паведаміў журналістам, што 1 верасня ўступае ў сілу абноўлены Кодэкс аб зямлі. Дакумент дазволіць на мясцовым узроўні вырашаць розныя зямельныя праблемы — самавольна занятых зямельных участкаў, незаконнага будаўніцтва на іх, змянення мэтавага прызначэння ўчастка. І тыя пытанні, якія агучылі жыхары вобласці, пасля 1 верасня будуць вырашаны шляхам прыняцця тэхнічнага рашэння райвыканкамам, Мінаблвыканкамам. Пасля адпаведнай працэдуры ўсе праблемы здымуцца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## The National Interest: хто б ні перамог ва Украіне, ЗША прайгралі ўжо

**Хто б ні перамог у канфлікце ва Украіне, ЗША ў стратэгічным плане пацерпяць паражэнне. Расія канчаткова адвернецца ад Еўропы і Вашынгтона і выбудуе больш цесныя адносіны з Кітаем, Індыяй, Саудаўскай Аравіяй і дзяржавамі Персідскага заліва.**

Як прэзідэнт ЗША Рычард Ніксан і дзяржсакратар Генры Кісінджэр у гады халоднай вайны разыгралі «кітайскую карту», каб ізаляваць Савецкі Саюз, так і Уладзімір Пуцін з Сі Цзіньпінам разыгрываюць свае карты, каб стрымаць глабальнае лідарства ЗША. Аб гэтым гаворыцца ў артыкуле амерыканскага часопіса The National Interest.

Ведаючы, што Еўропа больш не можа заставацца галоўным імпарцёрам расійскіх энергарэсурсаў, Расія павялічыла пастаўкі выкапнёвага паліва ў Азіяцкі рэгіён, асабліва ў Кітай і Індыю.

Так, пасля пачатку канфлікту ва Украіне Расія стала галоўным пастаўшчыком нафты для Кітая, пацясніўшы на кітайскім рынку Саудаўскую Аравію. У найбліжэйшыя гады Кітай і Расія, несумненна, інвесціруюць у пашырэнне нафта- і газатранспартнай інфраструктуры паміж дзвюма краінамі, што дасць магчымасць Расіі стаць асноўным пастаўшчыком выкапнёвага паліва ў Кітай. Кітайцы змогуць зменшыць сваю залежнасць ад паставак выкапнёвага паліва з Блізкага Усходу.

Умацаванне энергетычных сувязяў паміж Расіяй і Кітаем будзе садзейнічаць збліжэнню дзвюх краін, лічыць The National Interest. У будучым Масква і Пекін стануць стратэгічнымі саюзнікамі на еўразійскім кантыненце. Расія ў апошнія месяцы таксама значна пашырыла гандлёвыя зносіны з Індыяй.

## У Літве сёлета колькасць банкруцтваў вырасла амаль удвая

**У першым паўгоддзі 2022 года ў Літве колькасць прадпрыемстваў, якія запусцілі працэдуру банкруцтва, павялічылася ў 1,7 раза ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам, паведамляе Delfi са спасылкай на даныя Дэпартамента статыстыкі Літвы.**

У першым квартале бягучага года працэдуру банкруцтва распачалі 312 прадпрыемстваў, а ў другім — 274.

Адзначаецца, што больш за ўсё банкруцтваў прыпала на прадпрыемствы будаўнічага сектара, амаль удвая павялічылася колькасць банкруцтваў у сектары аптовага і рознічнага гандлю, такая сітуацыя складваецца таксама ў сферы аказання паслуг размяшчэння і харчавання.

Як мяркуе эканаміст са Swedbank Нерыюс Мачуліс, найбольш відавочная прычына сітуацыі, якая склалася, — узрослыя выдаткі на электраэнергію: з павелічэннем сярэдняй цаны на яе амаль у дзесяць разоў прадпрыемствы, якія не заключылі доўгатэрміновыя дагаворы з фіксаванай цаной, аказаліся ў нявыгадным становішчы. Другой магчымай прычынай ён назваў перапыненне гандлёвых сувязяў з Расіяй у другім квартале бягучага года.

## Экс-сенатар ЗША Блэк назваў існаванне НАТА вялікай трагедыяй



**Існаванне НАТА — адна з вялікіх трагедый усёй заходняй цывілізацыі, заявіў у інтэрв'ю РІА «Навіны» былы сенатар ад амерыканскага штата Вірджынія Рычард Блэк.**

На яго думку, трагедыяй стала тое, што НАТА не спыніла сваё існаванне тады ж, калі і Арганізацыя Варшаўскага дагавора. Ён прызнаў, што раней альянс быў пазітыўнай сілай, але сёння ён стаў дэстабілізуючым элементам у міжнародных адносінах. Як мяркуе палітык, далейшае пашырэнне НАТА за кошт уступлення ў яе Фінляндыі і Швецыі — жудасная справа.

Ён таксама назваў абсурдным і неверагодна дурным жаданне прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага вярнуць Крым. Украінскі лідар раней паведаміў аб намеры Украіны вярнуць Крымскі паўвостраў «любымі сродкамі, якія палічыць патрэбнымі, не раячыся з іншымі краінамі».

Героі жніва

# З НАСТАЎНІКА — У КАМБАЙНЕРЫ

**Іван СТРЫКУНОЎ па асноўнай сваёй рабоце — выкладчык фізкультуры ў сярэдняй школе аграгарадка Семукачы Магілёўскага раёна. Але на час летніх канікулаў ён ператвараецца ў камбайнера ААТ «Цішоўка». Кажа, што гэта работа для яго не менш звыклая, чым асноўная.**



— З пятнаццаці гадоў на камбайне, — усміхаецца ён. — Спачатку бацьку дапамагаў, потым стаў працаваць самастойна. Я чалавек вясковы, не прывык склаўшы рукі сядзець. Кожнае лета ўдзельнічаю ва ўборачнай. Лішняя капейка ніколі не перашкодзіць. Сёлета вось за месяц уборачнай больш чым тысячу зарабіў. У гаспадарцы ўборка ўжо завяршылася, але хапае іншай работы. Ворыва, пасяўная — трэба глебу рыхтаваць. Так што да 1 верасня яшчэ тут.

Жніво — пара гарачая, у полі са світанку да, лічы, поўначы. На цішоўскіх палях сёлета добра ўрадзілі трыцікале, пшаніца, ячмень.

— Пшаніца сёлета — не нарадавацца, — дзеліцца эмоцыямі Іван Анатольевіч. — Колькі гадоў на камбайне працую, а такую добрую не кожны год бачыў — буйная, налітая. І трыцікале месцамі нядрэннае.

Намалот настаўніка-камбайнера сёлета склаў 860 тон. Прызнаецца, што можна было б і больш высокі ўзровень узяць, але здараліся паломкі, ды і з-за надвор'я прыходзілася часам стаяць. Калі дождж з раніцы, то на поле выехаць можна было толькі пасля абеду. Дадому вяртаўся ў прыцемках. Сіл хапала толькі навіны паглядзець ды паесці. За дзень напрацуешся так, што есці хочацца моцна. І гэта нягледзячы на тое, што гаспадарка штодзень забяспечвае сытнымі абедамі і вячэрамі.

У калгасе настаўніка задзейнічаюць не толькі на жніве. І ён не адмаўляецца. Было, што пасля заняткаў з дзецьмі ў школе бег у другую змену глебу араць. А яна з 17.00 да 2-3 гадзін ночы.

— Мне нават больш падабаецца начная змена, — паціскае плячыма на маё здзіўленне суразмоўнік. — Святла ад фар дастаткова. Наогул пад начнымі зоркамі працаваць больш рамантычна. І навакольная мітусня не замінае.

Свой камбайн «Палессе» мужчына ведае да дробязяў — дзевяць гадоў працуе на адным і тым жа. Сам яго і рамантуе. Падчас уборачнай прыходзілася разбірацца з праводкай, мяняць падшыпнік. Таму працэс уборкі запаволіўся.

Тым не менш за работу на сёлетнім жніве Іван Стрыкуноў таксама адзначаўся — па прафсаюзнай лініі. Лічыць, праўда, што ўзнагародзілі яго авансам. Маўляў, не хапала крыху да танажу, а яго ўсё роўна заахвоцілі. Але людзі ведаюць, што ён чалавек старанны, працавіты. А яшчэ вельмі сціплы. Яму ўжо неаднаразова прапаноўвалі з'ездзіць у санаторый, для прафсаюзных актывістаў там існуюць добрыя зніжкі. Але ён адмаўляецца, кажа, што яму дастаткова розных паездак са школьнікамі. Вельмі важна адчуваць сваю карысць для грамадства, ад гэтага і настрой павышаецца, і прыліў сіл адчуваецца.

У гаспадарцы працуюць яшчэ бацька і брат настаўніка. Брат таксама быў задзейнічаны на жніве. Калі падлічыць агульны намалот братоў, каля дзвюх тысяч атрымаецца. І хоць працавалі на розных палях, азарт прысутнічаў. Пасля работы дзяліліся ўражаннямі, цікавіліся вынікамі. Цяпер брат Івана перасеў на трактар, разам з бацькам задзейнічаны ў ворыве. А Іван Анатольевіч свой камбайн да ладу давядзе (штуцэр паляцеў, трэба памяняць) і працягне выконваць прыватныя заказы па ўборцы прысядзібных «сотак». У апошнія жнівенскія дні знаходзіцца шмат жадаючых скарыстацца паслугамі камбайнера, каб прыбраць ячмень, авёс, пшаніцу для свойскай жывёлы. Гаспадарка нікому не адмаўляе. Іван Стрыкуноў ужо аб'ехаў на сваім камбайне палову вёсак Магілёўскага раёна. Семукачы, Сінюга, Алень, Запаточча, Вялікія Бялевічы — заказаў столькі, што толькі паспявай выконваць. І настаўнік стараецца нікога не пакрыўдзіць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Івана СТРЫКУНОВА.**

Надвор'е

# З наступнага тыдня стане халадней

**У Беларусі ў пачатку наступнага тыдня пахаладае, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

«Па перыферыі шырокага антыцыклону на тэрыторыю нашай краіны пранікаюць паступаць вельмі цёплыя паветраныя масы трапічнага паходжання. Сярэдні тэмпературны фон па краіне на 4—10 градусаў перавышае кліматычную норму месяца, а антыцыкланальны характар надвор'я прывёў да недабору ападкаў. У цэлым па краіне за мінулы перыяд выпала ад 4 % да 50 % месячнай нормы ападкаў, і толькі па крайнім паўднёвым захадзе лівневыя дажджы ў пачатку месяца крыху перавыканалі месячны план. Гарачае надвор'е захаваецца ў Беларусі да канца тыдня, пры гэтым у пятніцу ў асобных раёнах па паўночным захадзе, у нядзелю месцамі па паўднёвым усходзе ёсць верагоднасць кароткачасовых навальнічных дажджоў», — распавялі ў Белгідрамеце.

У пятніцу, 26 жніўня, будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным захадзе краіны месцамі чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 14—20, месцамі — 10—13 градусаў цяпла. Днём будзе плюс 27—32, у паўднёвых раёнах да плюс 33-34 градусаў.

У суботу, 27 жніўня, прагназуецца пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ноччу будзе 13—19 градусаў цяпла. Днём паветра прагрэецца да плюс 27—33.

У нядзелю, 28 жніўня, чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература ўначы складзе 12—19 градусаў цяпла. Днём будзе плюс 24—30, месцамі да плюс 32 градусаў.

У панядзелак, 29 жніўня, у большасці раёнаў краіны яшчэ захаваецца цёплае надвор'е. Разам з тым пры лакальным развіцці кучава-дажджавой воблачнасці вялікая верагоднасць летніх навальнічных дажджоў. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 градусаў цяпла.

Па папярэднім прагнозе, у аўторак характар надвор'я зменіцца. Чакаецца паніжэнне тэмпературнага фону.

У аўторак, 30 жніўня, з Заходняй Еўропы чакаецца перамяшчэнне сістэмы франтальных раздзелаў, услед за якой пачнуць распаўсюджвацца больш прахалодныя паветраныя масы. Уначы месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ноччу будзе плюс 10—17. Днём паветра прагрэецца да плюс 18-25, у паўднёва-ўсходніх раёнах да плюс 26-27, па поўначы месцамі чакаецца 15—17 градусаў цяпла.

# У НАВУЧАЛЬНЫ ГОД — З БЕЛАРУСКІМ ПАШПАРТАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Новенькі школьны заплечнік з неабходнымі прыладамі без пяці мінут першакласнік Чарацянскага дзіцячага сада — базавай школы Дарафей Шаўчук толькі што атрымаў у падарунак ад актывістак мясцовай «пярвічкі» Гомельскай раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын. Павіншаваць з надыходзячым першым навучальным годам прыходзілі не чужыя — свае: смяяліся, абдымаліся, «фоткаліся»... Гэта натуральна, усе ведаюць адзін аднаго, сябруюць. Так «праводзіны» ў школу, лічы, усёй вёскай успрымае шасцігадовы сынок Ігара і Наталлі Дарафей і малодшая дачушка Дарынка, якой у школу толькі праз два гады. Але малая па-простаму перадае, што таксама будзе чакаць падарунка ў першы клас, толькі хоча ружовы рукзак.

Дзеці Шаўчукоў у Чарацянцы ўсё сваё жыццё, аграгарадок успрымаюць сваім домам.

— Сына нарадзіла ва Украіне, а як яму было дзесяць дзён, вярнулася зноў сюды, дадому. Не было ніякіх праблем з афармленнем дапамогі па доглядзе за дзіцем наогул. У мяне на ўкраінскай былі дакументы на сына, дык прынесла ў сельсавет, у нашу гаспадарку, дзе працавала да дэкрэтнага, і ўсё зрабілі самі, — прызнаецца маладая жанчына, а як даведваецца, што гісторыю пра яе сям'ю напішу па-беларуску, шчыра дзякуе:

— Украінская і беларуская для мяне, як адна мова. Тут, у прыгранічча, у Чарацянцы і Маркавічах увогуле, як я кажу, у кожным доме — кавалачак Украіны. Я, здараецца, разумею па-беларуску лепш за некаторых, хто тут нарадзіўся, перакладаю, — смяецца яна.



**Ветэрынарны ўрач Ігар ШАЎЧУК працу па спецыяльнасці і годны заробак восем гадоў таму знайшоў у ААТ «Сцяг Радзімы».**

Наталля і Ігар Шаўчукі пераканaныя: ім вельмі пашанцавала не толькі з месцам, дзе абсталяваліся, але і з калектывам, у які ўладкаваліся. Муж — ветэрынар, жонка — сакратар у гаспадарцы «Сцяг Радзімы», дарэчы, адной з наймацнейшых сельгасарганізацый не толькі Гомельскага раёна, але і ўсяго рэгіёна. Знайшоў самае роднае цяпер для іх месца менавіта бацька маладога сямейства. Знайшоў выпадкова, праз аб'яву аб вакансіях. Атрымаў не толькі работу, дастойную зарплату, але і жыллё.

— У Гомель у медыцынскі ўніверсітэт якраз у 2014-м паступіла мая малодшая сястра Марыя, — тлумачыць Наталля. — Я на той момант скончыла магістратуру Адэскага аграрнага ўніверсітэта, атрымала дыплом бухгалтара-эканаміста. А вось для мужа з дыпломам ветэрынара ў нас там ва Украіне не было ніякай перспектывы ў рабоце. Сястра ж была пад такім уражаннем ад Беларусі і Гомеля, што мы вырашылі — пераязджаем. У нас не было нейкіх палітычных мэт, мы не бежанцы. Мы шукалі сваё месца для нармальнага жыцця. Нехта едзе ў Расію, нехта ў Польшчу, а мы выбралі Беларусь. Усе нашы родныя, дарэчы, вельмі рады за нас, — тлумачыць Наталля.

Ад гаспадаркі атрымалі спачатку кватэру ў Маркавічах. Пяць гадоў таму — ужо катэдж на вуліцы, дзе жывуць усе сем'і работнікаў гаспадаркі «Сцяг Радзімы»: разам працуюць, сябруюць сем'ямі...

— Нам вельмі пашанцавала з домам: проста цераз дарогу — наш сад-школа. Я і дачку са спакойным сэрцам у садок аддала з двух гадоў. Не таму, што грошай не хапала, не падумайце. У нас тата вельмі дастойна зарабляе, і ў мяне дапамога па доглядзе за дзецьмі была добрая, але вельмі хацелася на работу. Якраз прапанавалі новае месца сакратара. І я не разважала.

У гаспадарцы жонку і мужа Шаўчукоў цэняць, работнікі калектыву — адказваюць узаемнасцю.

— Працую ў вёсцы Глыбоцкае. Там знаходзяцца два вытворчыя падраздзяленні «Сцяга Радзімы» — малочнатаварная ферма і малочнатаварны комплекс. Вельмі адказны ўчастак работы, бо па вытворчасці малака гэтыя падраздзяленні — адны з вядучых у гаспадарцы, — дадае галава сям'і — Ігар Шаўчук.

Шаўчукам падабаецца не толькі працаваць, але і жыць на вёсцы. У іх свая вялікая прысядзібная гаспадарка — гадуюць свінак і курачак, апрацоўваюць 30 сотак зямлі. Паставілі вялікую цяпліцу. Кажуць, пасля Украіны з яе ўрадлівымі землямі, дзе і вялікіх нейкіх намаганняў не трэба: пасадзіў — і само вырасла, тут складаней, землі не такія, але цікава шукаць свае падыходы.

Наталля расказвае, што родныя і знаёмыя з Украіны заўжды цікавяцца ў сям'і, як ім жывецца-працуецца ў Беларусі, шчыра радуюцца, што маладая сям'я добра ўладкавалася пад Гомелем. У Вінніцкай вобласці засталіся жыць бацькі і родныя Ігара і Наталлі. Яны час ад часу прыязджаюць у Гомельскі раён да дзяцей у госці. Родныя падтрымліваюць жаданне маладой сям'і атрымаць беларускае грамадзянства. Ніяк не змяніліся адносіны паміж сваякамі і пасля пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі Расіі ва Украіне.

— Цікава, што мы знаходзімся на самым прыгранiччы з Украінай, а на беларускай зямлі тут адчуваем сябе цалкам абароненымі. Для нас важна, што мы тут адчуваем сябе дома. І так было ўсе восем гадоў. Сынок цяпер ідзе ў беларускую школу, і мы спакойныя. Мы з пасведчаннем на права жыхарства маем такія ж правы і льготы, як і беларусы. Адзінае, што ў нас медыцынская дапамога на платнай аснове. Але пакуль дзеці раслі, калі патрэбная была меддапамога, ніхто ні разу не сказаў нам тут: «Вы ідзіце ў касу, аплаціце, а потым мы вам дапаможам». Для мяне як для мамы гэта дарагога варта.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# НЯМА МЯЖЫ ДЛЯ ДАСКАНАЛАСЦІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нейрабіёлагі сцвярджаюць, што атрыманне новых ведаў і навыкаў — практычна панацэя ад усіх «узроставых» бед мозгу. Псіхолагі дадаюць, што найлепшы адпачынак — змена працоўнай дзейнасці, а вывучэнне чаго б там ні было (ад замежных моў да ўсходніх танцаў) у любым узросце дорыць канкрэтныя мэты і ратуе ад дэпрэсіі. І, нарэшце, менеджары па персанале вылучаюць, мабыць, самы важкі аргумент: дадатковая адукацыя дазваляе павысіць кваліфікацыю (чытай — аплату працы), пашырае магчымасці працаўладкавання, і часам з яе дапамогай можна перайсці ў зусім новую прафесію. Гадоў 50 таму «вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца» з плаката раіў Уладзімір Ільіч. У сучасных сур'ёзных кампаніях, дзе працаваць прэстыжна, а зарабляюць годна, выкарыстоўваецца тэрмін lifelong learning (навучанне даўжынёю ў жыццё). Ну, а ў народзе кажуць: «Веды за плячыма не насіць». Такім чынам, па прыкладзе ўласных дзяцей дарослым таксама будзе не лішнім з верасня сесці за ўмоўную «парту». Тым больш у наш час актыўна развіваюцца дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, і магчымасцяў для навучання — на любы густ, графік і кашалёк. Патрэбныя толькі жаданне і матывацыя.

**Для дзяцей IT-курсы — гэта выдатны варыянт. Псіхолагі раяць: пакуль дзіцяці не прыйшоў час выбіраць прафесію, паспрабаваць як мага больш розных курсаў, заняткаў і секцый. Гэта дапаможа зразумець, да чаго ў малога або падлетка ёсць схільнасць, што яму цікава. Але бацькам лепш знізіць чаканні: наўрад ці IT-курсы стануць «пачаткам вялікага шляху.**

Але з апошняй ёсць пытанні... Падлічана, што да канца самых розных анлайн-курсаў у сярэднім даходзіць каля паловы першапачатковага набору — астатнія паступова сыходзяць з дыстанцыі. Больш працэнт дасягае заканчэння курсаў, дзе заняткі праводзяцца «ўжывую», але гэта таксама не 100 % і часта нават не 80. Псіхолагі кажуць: парыў «О, цікава!» па меры навучання змяняецца разуменнем, што на самай справе чалавеку гэта не трэба і ён не гатовы прыкладаць намаганні, якіх патрабуюць выкладчыкі. Каб не марнаваць грошы, лепш дакладна сфармуляваць для сябе, якой вы бачыце канкрэтную мэту тых ці іншых заняткаў, раяць яны.

## НОВЫЯ ВЕДЫ — НОВАЕ ЖЫЦЦЁ?

Пройдземся па самых запатрабаваных на сёння адукацыйных і развіццёвых напрамках. І пачнём з дадатковай адукацыі, так ці інакш звязанай з магчымасцю працы і заробку. Не будзем спыняцца на «павышэнні кваліфікацыі»: парады тут залішнія: спецыяліст і сам ведае, што яму патрэбна. А вось калі захацелася вывучыць нешта, мала звязанае ці ўвогуле не звязанае з асноўнай прафесіяй? Тут лідзіруюць два напрамкі: першы, зразумела, IT-курсы і другі — вывучэнне замежных моў.

Пра тое, што веды ў сферы IT-тэхналогій дазваляюць мець высокія заробкі, сёння вядома ўсім і кожнаму. У ВНУ самыя высокія конкурсы — на «айцішныя» спецыяльнасці. І калі вы выгарэлі на сваёй працы або не можаце працаўладкавацца, вас, хутчэй за ўсё, ужо наведвала думка аб IT-курсах.

Але выкладчыкі гэтых курсаў кажуць пра тое, што так званая IT-сфера — гэта цэлы спектр прафесій, і калі вы далёкія ад яе, то зразумець, што ж канкрэтна вы хочаце вывучаць і чым займацца, часам складана. І перш за ўсё важна зразумець: калі ў вас не лагічнае, матэматычнае або інжынернае мысленне, калі вы ярка выражаны гуманітарый, хутчэй за ўсё, вам будзе на такіх курсах складана, сумна. І нават калі на сіле волі вы зможаце іх скончыць, наўрад ці ў гэтым будзе сэнс. Тым больш што тыя самыя «айцішнікі», якія добра зарабляюць, — гэта людзі з профільнай універсітэцкай адукацыяй плюс курсы, плюс практыка. Іншая справа — калі ваша адукацыя або род заняткаў былі звязаны з сумежнымі сферамі або з дакладнымі навукамі — цалкам магчыма, «айцішныя» курсы дадуць у гэтым выпадку чаканы вынік, асабліва калі вы ясна разумееце, чаго ад іх чакаеце.

— Дадатковая адукацыя сапраўды можа змяніць ваша жыццё, вы можаце знайсці працу ў іншай галіне, — кажа Іван, выкладчык курсаў праграмавання ў Мінску. — Але да пытання трэба падысці сур'ёзна. Пачніце



з вывучэння вакансій, якія вам былі б цікавыя, а таксама патрабаванняў кампаній да спецыялістаў, якіх яны шукаюць. Пазнаёмцеся з навучальнымі праграмамі курсаў, суаднясіце першае і другое. Важна разумець: у кардынальна новую сферу з аднымі толькі курсамі ўвайсці не атрымаецца. Спатрэбяцца гады вучобы і практыкі. Можа быць, лепш выбраць сумежную спецыяльнасць: дасягнуць у ёй поспеху больш рэальна, чым у цалкам новай для вас галіне.

А вось для дзяцей IT-курсы — гэта выдатны варыянт. Псіхолагі раяць: пакуль дзіцяці не прыйшоў час выбіраць прафесію, паспрабаваць як мага больш розных курсаў, заняткаў і секцый. Гэта дапаможа зразумець, да чаго ў малога або падлетка ёсць схільнасць, што яму цікава. Але бацькам лепш знізіць чаканні: наўрад ці IT-курсы стануць «пачаткам вялікага шляху». Больш разумна ставіцца да іх гэтак жа, як, скажам, да секцыі таэквандо або тэатральнай студыі: карысна, развівае, дазваляе дзіцяці даведацца пра сябе — і не больш.

## АБ ЧЫМ РАЗМОВА?

Моўныя курсы — яшчэ адзін запатрабаваны кірунак дадатковай адукацыі. Замежную мову вывучыць модна і карысна, «мовамі не валодаць» у нашы дні — неяк няёмка. Найбольш запатрабаваная для вывучэння з замежных, відавочна, англійская. Прапанова тут велізарная, ёсць анлайн- і афлайн-варыянты, групы і індывідуальныя заняткі.

— Выбіраць групу або форму заняткаў «сам-насам» трэба зыходзячы з вашага характару, — тлумачыць Ігар, выкладчык англійскай мовы адной з найстарэйшых моўных школ Беларусі. — Група дазваляе мець камунікацыю, заняткі «адзін на адзін» — лепш засяроджвацца на матэрыяле. Калі вы пачынаеце з нуля («у школе вывучаў, потым забыўся»), то я раю выбраць групу. Па-першае, гэта танней, па-другое, весялей, плюс калі ўсе пачынаюць з нуля, то матывуюць і падтрымліваюць адзін аднаго. Калі ж пэўная база ў вас ужо ёсць і ваша задача — ліквідаваць прабелы, то лепш выбраць індывідуальныя заняткі: выкладчык пабудуе праграму канкрэтна пад вас і надасць больш увагі таму, што вы хочаце падцягнуць (граматыку, гаворку і г. д.).

Але самае галоўнае для вывучэння любой замежнай мовы — наяўнасць выразнай матывацыі, дакладнае, а не расплывістае разуменне мэты. Таму што вывучэнне мовы патрабуе ад вучня (у дадзеным выпадку — ад дарослага чалавека, які, з аднаго боку, ужо адвык вучыцца, з другога — да занятку паспеў адпрацаваць 8 гадзін) сур'ёзнай і досыць манатоннай працы, і без рэальнай матывацыі жаданне яе рабіць хутка знікне.

— «Падарожжы» — няправільная матывацыя. Для падарожжаў замежная мова непатрэбная, дастаткова размоўніка

**Псіхолагі кажуць: парыў «О, цікава!» па меры навучання змяняецца разуменнем, што на самай справе чалавеку гэта не трэба і ён не гатовы прыкладаць намаганні, якіх патрабуюць выкладчыкі.**

або дадатку ў смартфоне. «Для агульнага развіцця», «каб чытаць Шэкспіра ў арыгінале» — таксама не будзе працаваць. Самая дзейсная матывацыя — канкрэтная перспектыва кар'ернага росту або працаўладкавання.

Каб дасягнуць нейкага рэальнага выніку ў вывучэнні замежнай мовы і ўбачыць свой прагрэс самому, патрабуецца не менш за паўгода. «Праз месяц вы загаварыце па-англійску з нуля» — не больш чым рэкламны ход, нічога агульнага з рэальнасцю ён не мае, кажа суразмоўца.

— Абавязковая ўмова — шмат працаваць самастойна. Рабіць хатнія заданні, вучыць словы, у ідэале — слухаць аўдыякнігі і глядзець фільмы на той мове, якую вывучаеце.

Што датычыцца дзяцей, то аптымальны ўзрост для вывучэння замежнай мовы — 6-7 гадоў, адзначаюць выкладчыкі. Калі бацькі самі не гавораць на дадзенай мове і дома яна не гучыць, спрабаваць зрабіць з дзіцяці паліглота раней не варта. І менавіта для дзяцей лепш выбіраць групу. Бо мова апрыёры — сродак камунікацыі. У групе дзіця вучыцца ўспрымаць замежную мову на слых і мець зносіны на ёй. Індывідуальныя заняткі пажаданыя, толькі калі трэба дасягнуць канкрэтнай мэты — напрыклад, падрыхтавацца да іспыту.

— Пры вывучэнні замежнай мовы дзіцем прынцыповы бацькоўскі кантроль. Аб важнасці выканання хатніх заданняў я ўжо казаў — без гэтага заняткі стануць пустым

**«Самая дзейсная матывацыя — канкрэтная перспектыва кар'ернага росту або працаўладкавання».**

марнаваннем грошай. Яшчэ адзін складнік поспеху — зваротная сувязь з выкладчыкам. Яе наяўнасць абавязкова трэба ўдакладніць пры выбары моўных курсаў.

## НЕ ТОЛЬКІ ЗМЕСТ, АЛЕ І ФОРМА

Многія вырашаюць з верасня прапампаваць не мозг (ну, або не толькі мозг), а цягліцы. У трэнажорных залах, у жніўні гулкіх і пустых, з верасня пачынаецца бум. Праўда, да пачатку лістапада вельмі многія з тых, хто прыйшоў у верасні, вырашаюць: «Трэнажорка — усё ж не маё».

— Першыя бачныя ў люстэрку станоўчыя перамены прыйдуць толькі праз паўтара-два месяцы, — распавядае Мікіта, інструктар адной з сетак трэнажорных залаў. — Крыўдна, калі людзі перастаюць хадзіць у залу, не дайшоўшы да гэтага моманту. Так бывае, калі чалавек першапачаткова прыходзіць з няправільнай матывацыяй — як мы кажам, «для сэлфі».

Але, акрамя выкінутых на вецер грошай, двух месяцаў цалкам дастаткова, каб пры няправільных занятках нанесці шкоду здароўю або атрымаць траўму.

— Трэнажорная зала можа быць дастаткова траўматычным месцам, таму вельмі важна хоць бы напачатку займацца з трэнерам, і трэнер павінен быць адукаваным. Я наогул раіў бы прыходзіць не «ў залу», а «да трэнера».

Знайсці добрага трэнера «па качу» — задача няпростая, адзначае суразмоўца. Памятайце: знешні выгляд трэнера — не гарантыя яго ведаў. Рэльефныя мышцы і фігура Апалона кажуць у першую чаргу аб добрай генетыцы, па-другое, могуць быць вынікам «дыеты са стэроідаў». Ну, а па-трэцяе, не кожны добры спартсмен адначасова і добры трэнер. Правіла такое: знаёмства з трэнерам павінна пачынацца з яго пытанняў да вас. Перш за ўсё, ён павінен распытаць аб вашых мэтах (схуднець, набраць, падкарэктаваць постаць і г. д.), а таксама аб стане здароўя (наяўнасць хвароб суставаў, сардэчна-сасудзістых захворванняў і г. д.).

— Цікава, што апошнім часам у нашай сферы з'явілася досыць шмат трэнераў-дзяўчат, і калі хлопцы часта ідуць па схеме «бяры больш — кідай далей», то дзяўчаты звычайна падыходзяць да пытання скрупулёзна, шмат чытаюць і будуюць трэніроўкі, што называецца, «па навуцы».

Так што, калі выбераце трэнера-дзяўчыну, у вас з'явіцца больш шанцаў атрымаць сапраўды прафесійныя трэніроўкі. А ў цэлым, выбіраючы любую спартыўную секцыю для сябе і асабліва для дзіцяці, задайце трэнеру пытанне аб яго фізкультурнай адукацыі: дзе ён яе атрымліваў і ці можа пацвердзіць дыпломам. А таксама распытайце аб яго спартыўных дасягненнях, раіць трэнер клуба адзінаборстваў Міхаіл.

— Многія бацькі дапускаюць памылку — не задаюць такіх пытанняў трэнеру свайго дзіцяці. Не бойцеся пытацца: «Якую адукацыйную ўстанову вы заканчвалі? Дзе выступалі?» Нармальны трэнер ахвотна расказа і аб сваёй адукацыі, і аб спартыўнай кар'еры. Бо ніякі «чорны-прычорны» пояс трэнера не адмяняе неабходнасці фізкультурнай адукацыі, асабліва калі ён працуе з дзецьмі (ды і з дарослымі вучнямі гэта таксама важна). І яшчэ: лепш арыентавацца на клубы, што зарэкамендавалі сябе. Тым больш у Беларусі ёсць спартыўныя клубы сусветнага ўзроўню. Яны на слыху, іх назвы — міжнародныя брэнды, і гэта гарантыя, што трэнеры там дакладна не нашкодзяць навучэнцам.

**Дзіяна РОНІНА.**

Наша кіно

# ЧАЛАВЕК ВАЧАМІ ІНШЫХ

**У суботу, 3 верасня, у дзённым эфіры тэлеканала «НТБ-Беларусь» чакаецца паказ фільма «Гарантую жыццё», знятага рэжысёрам Барысам Сцяпанавым, які выйшаў на «Беларусьфільме» ў 1977 годзе.**

Герой кінастужкі — інжынер-выпрабавальнік Дзмітрый Радкевіч, які загінуў падчас выпрабаванняў найноўшай катапульты на небывалых вышыні і хуткасці. Вобраз гэтага чалавека ствараецца з аповедаў яго блізкіх людзей, сяброў і таварышаў па рабоце. Кожная з навел — «Першае каханне», «Жонка», «Справа», «Мама» — адкрываюць гледачам новыя грані характару гэтага незвычайнага мужчыны, сціплага, мяккага і разам з тым непахіснага, перакананага ў сваіх поглядах. Трэба сказаць, што ў аснову фільма была пакладзена аповесць «Трывожныя вышыні» беларускага пісьменніка Івана Чарныха, які стаў і адным з аўтараў сцэнарыя будучай кінаработы.

Самому аўтару твора добра вядомы свет авіяцыі, таму што па першай сваёй спецыяльнасці ён таксама быў прафесійным ваенным лётчыкам і адлётаў 10 гадоў на баявых самалётах пасля заканчэння вучылішча лётчыкаў далёкай авіяцыі. Аднак у галоўнага героя аповесці і фільма Дзмітрыя Радкевіча быў і рэальны прататып — беларускі парашутыст-выпрабавальнік, майстар спорту, неаднаразовы рэкардсмен свету, старшы лейтэнант-інжынер Валянцін Даніловіч. Ён першы сярод савецкіх парашутыстаў-выпрабавальнікаў пераадолеў звышгукавы бар'ер пры выпрабаванні новай канструкцыі катапультнай сістэмы.



І загінуў 20 мая 1970 года якраз падчас выпрабавання доследнай катапультнай устаноўкі. Чым больш кожны з нас будзе даведвацца такіх імён і біяграфій, тым даўжэй будзе жыць памяць пра сапраўдных герояў.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 153

Сваю новую задачу даслаў нам Міхаіл Кошаль з Мінска ***(гл. дыяграму).***



**Белыя:** Kph5, Фс2, Лс7, Са2, Се7, Kd8, пп. d7, e4, g4 (9).

**Чорныя:** Kpe5, пd5 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Міжнародны турнір у Мінску (157 удзельнікаў, у тым ліку 7 міжнародных гросмайстраў, 14 міжнародных майстроў і майстроў ФІДЭ) выйграў міжнародны майстар Дзяніс Лазавік, на другім месцы гросмайстар Міхаіл Нікіценка — у абодвух па 7,5 бала з 9 магчымых. 3-8 месцы з 7 баламі падзялілі гросмайстры Аляксей Аляксандраў, Андрэй Гаравец, Міхаіл Бракін, міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі, майстры ФІДЭ Арцём Сіняўскі і Ксенія Зелянцова. На 9-12 месцах (па 6,5 бала) — майстры ФІДЭ Арцём Стрыбук, Варвара Палякова, міжнародны майстар Кацярына Смірнова, Ксенія Норман. Гросмайстар Аляксей Фёдараў падзяліў 13-26 месцы (6 балаў). Усе згаданыя шахматысты — з Беларусі, апрача расіян М. Бракіна і К. Смірновай.

Вось некалькі партый з гэтага спаборніцтва.

Вячаслаў Зарубіцкі — Дзяніс Лазавік. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cc4 Cc5 4. 0-0 Kf6 5. d3 d6 6. c3 a6 7. Cb3 h6 8. Kbd2 0-0 9. h3 Ce6 10. Cc2 d5 11. ed Ф:d5 12. Ле1 Лad8 13. Фе2 Лfe8 14. b4 Cf8 15. a4 Kh5 16. Ke4 f5 17. c4 Фd7 18. Kc5 C:c5 19. bc Cf7 20. Лb1 Kf6 21. Cb2 Ch5 22. Фе3 f4 23. Фе2 Kd4 24. C:d4 ed 25. Фd2 C:f3 26. gf Фf5 27. Л:b7 Ф:h3 28. Cd1 Л:e1+ 29. Ф:e1 Ле8 30. Фf1 Фh5, 0:1.

Максім Царук — Міхаіл Нікіценка. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kd2 c5 4. ed ed 5. Kgf3 Kc6 6. Cb5 Фе7+ 7. Ce2 Фс7 8. 0-0 Cd6 9. dc C:c5 10. Kb3 Ce7 11. c3 Kf6 12. Cg5 Ce6 13. Kbd4 0-0 14. Ле1 Лае8 15. Cd3 K:d4 16. cd Cg4 17. Cb5 Лс8 18. Фb3 Ce6 19. Cd3 h6 20. Лас1 Фb8 21. Cd2 Ke4 22. Cb4 Л:c1 23. Л:c1 Фf4 24. Лс2 C:b4 25. Ф:b4 Cg4 26. Ke5 Cd1 27. g3 Фf5 28. Лd2 Фh5 29. C:e4 de 30. Ф:b7 f5 31. Фс6 Лf6 32. Фс1 Ce2 33. Фе1 Ca6 34. b3 Фh3 35. Kc4 f4 36. Ф:e4 C:c4 37. bc f3 38. Фа8+ Лf8 39. Фd5+ Kph8, 0:1.

Ксенія Зелянцова — Мікіта Раманоўскі. 1. e4 e5 2. Kc3 Kf6 3. Cc4 K:e4 4. Фh5 Kd6 5. Cb3 Ce7 6. Ф:e5 0-0 7. Kge2 c6 8. d4 Ke8 9. d5 d6 10. Фg3 Kf6 11. 0-0 c5 12. h3 Kbd7 13. Kb5 Kb6 14. c4 Cf5 15. Kbc3 Ле8 16. Фf3 Cg6 17. Kg3 Kfd7 18. Cf4 Cf8 19. Лfe1 Ke5 20. C:e5 Л:e5 21. Л:e5 de 22. Лd1 Cd6 23. Kge4 a6 24. h4 C:e4 25. K:e4 g6 26. g4 Фе7 27. g5 Лf8 28. Фg4 h5 29. gh Kph7 30. Фg5 f5 31. Ф:e7+ C:e7 32. d6 C:h4 33. K:c5 Лс8 34. K:b7 Kd7 35. c5 K:c5 36. d7 K:d7 37. Л:d7+ Kp:h6 38. Kd6 Лс1+ 39. Kpg2 Ле1 40. Kf7+, 1:0.

* * *

Як мы ўжо паведамлялі, у Чэнаі (Індыя) прайшла 44-я сусветная шахматная алімпіяда. Расія і Беларусь, а таксама Кітай сёлета на дадзеным форуме не выступалі.

У мужчынскім турніры перамог Узбекістан, на другім месцы — Арменія, на трэцім — другая зборная Індыі (па традыцыі арганізатары могуць выстаўляць ад сваёй краіны некалькі камандаў). На наступных месцах адпаведна Індыя (першая каманда), ЗША, Малдова, Азербайджан, Венгрыя, Польшча, Літва і Нідэрланды.

У жаночым турніры чэмпіёнкамі сталі шахматысткі Украіны, сярэбраныя медалі ў Грузіі, бронзавыя — у Індыі. У дзясятку найлепшых трапілі таксама ЗША, Казахстан, Польшча, Азербайджан, Індыя-2, Балгарыя і Германія.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фd1! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Уладзімір Ізотаў, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКА.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# КАЛІ КЛАСІКА АЖЫВАЕ НА ЭКРАНЕ...

**На наступным тыдні традыцыйна пройдзе Дзень беларускага пісьменства. Свята будзе мець шмат цікавых і адметных акцэнтаў і падзей. Не абмінуць іх увагай і ў тэлеэфіры. Сярод найбольш адметных падзей — і 95-годдзе з дня нараджэння пісьменніка, кінасцэнарыста, публіцыста, грамадскага дзеяча Алеся Адамовіча. На сацыякультурным канале «Беларусь 3» пакажуць кінараманы «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой», знятыя па матывах рамана беларускага класіка.**

Абодва фільмы з'яўляюцца экранізацыяй дылогіі «Партызаны» (у творы пісьменнік апісаў падзеі свайго ваеннага дзяцінства), а даў ім новае жыццё на кінастудыі «Беларусьфільм» легендарны рэжысёр Віктар Тураў. Так, у суботу ўбачым кінастужку «Вайна пад стрэхамі» (1967 г.). Яе дзеянне пераносіць гледача ў часы пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Не здолеўшы эвакуіравацца, застаецца ў акупацыі ў невялікім беларускім паселішчы сям'я Ганны Міхайлаўны Корзун. Жанчына па прафесіі — аптэкар, яна пачынае дапамагаць партызанам, але разам з тым імкнецца засцерагчы ад небяспекі дзяцей. А людзі, якія засталіся на захопленай тэрыторыі, нібы раздзяліліся. Адны жадаюць змагацца і біць ворагаў, як, напрыклад, мастак, вымушаны апрануць для выгляду шынель паліцая. Іншыя ж проста ідуць служыць у паліцыю, таму што ім так выгадней і савецкую ўладу яны не любяць. Ёсць там і трэцяя катэгорыя — людзі, якія спадзяюцца проста адседзецца, назіраючы за ўсімі падзеямі, каб іх не чапалі ні немцы,



ні партызаны. Аднак кожны сутыкаецца з неабходнасцю выбару — ці ўступаць ім, мірным людзям, у барацьбу з фашыстамі.

